*А. А. Гулак*

# РЭЦЭПЦЫЯ ІДЭЙ МІФАЛАГІЧНАГА КІРУНКУ XIX ст. СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКАЙ

У айчыннай навуцы прызнаецца, што даследчыкі П. Шпілеўскі, А. Кіркор, П. Бяссонаў, П. Шэйн, а таксама ў некаторай ступені А. Багдановіч, М. Доўнар-Запольскі, Я. Ляцкі, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў аддавалі даніну філасофскім і метадалагічным установкам міфалагічнага кірунку. Сёння здабыткі міфолагаў XIX ст. увайшлі ў акадэмічныя выданні па беларускім фальклоры і міфалогіі і развіваюцца сучаснымі фалькларыстамі, этнолагамі, літаратуразнаўцамі, гісторыкамі, археолагамі і філосафамі. Вывучэнне міфалагічнага кірунку з'яўляецца важнай умовай не толькі цэласнага даследавання гісторыі беларускай фалькларыстыкі, але і крытычнай ацэнкі сучасных даследаванняў у галіне беларускай, славянскай міфалогіі. Надзвычай актуальным у гэтым сэнсе з'яўляецца вызначэнне таго, якія складальнікі тэарэтычнай спадчыны міфалагічнага кірунку XIX ст. прызнаныя сучаснай навукай.

Адразу адзначым, што асноўнымі «момантамі пераемнасці» з'яўляюцца разуменне міфалогіі як першаснай формы свядомасці і светапогляднай асновы традыцыйнай культуры беларусаў, узаемасувязь міфалогіі з мовай і паэтычнай творчасцю, асэнсаванне міфапаэтычных формаў народнай культуры як здольных да трансфармацыі.

У міфалагічных даследаваннях XIX ст. не асэнсавана, што комплекс «беларускага» язычніцтва ўтварыўся ў выніку складаных працэсаў, аб чым сведчаць расплывістасць і няўстойлівасць міфалагічных формаў і праяўленняў, аднак захаванне ва ўсходнеславянскай міфалогіі агульных рыс з міфалагічнымі сістэмамі індаеўрапейскіх народаў і наяўнасць пры гэтым адметных рыс, узаемаўплыў язычніцкай і хрысціянскай традыцый адзначаны выразна.

У працах прадстаўнікоў міфалагічнага кірунку ўпершыню сцверджаны тэзіс аб дуалістычнай аснове славянскага язычніцтва, абазначана спецыфіка ўсходнеславянскага язычніцтва (неваяўнічы характар багоў, лакалізацыя сакральных персанажаў на зямлі або перыядычнае існаванне іх у рэальным зямным свеце (акрамя Перуна)), праяўленне сябе праз непасрэдныя адносіны з людзьмі.

Рэканструкцыя міфалагічных сюжэтаў пры дапамозе па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раўнальна-гістарычнага даследавання рэфлексаў гэтых сюжэтаў у беларускай і іншых этнічных традыцыях з'яўляецца метадалагічным здабыткам міфолагаў, засвоеным сучаснай навукай. У працах міфолагаў XIX ст. запачаткаваны міждысцыплінарныя даследаванні беларускай міфапаэтычнай спадчыны, сёння яны ўяўляюць сінтэз традыцыйна-фалькларыстычных падыходаў з метадалогіяй культурнай антрапалогіі, лінгвістыкі, семіётыкі і з'яўляюцца асноўнай стратэгіяй у вывучэнні ўсходнеславянскага язычніцтва.

Прадстаўнікамі міфалагічнага кірунку XIX ст. на пачатковым узроўні асэнсаваны пяць тыпаў крыніц міфалагічнага даследавання: пісьмовыя, фальклорныя, археалагічныя, этнаграфічныя і лінгвістычныя; рэканструкцыя міфолагамі славянскага язычніцкага пантэона адбывалася пераважна на падставе пісьмовых крыніц (сярод якіх не вылучаліся крыніцы «другасныя»), а матэрыялам для апісання персанажаў ніжэйшай міфалогіі служылі пераважна фальклорныя і лінгвістычныя крыніцы.

Галоўнай праблемай у вывучэнні славянскай міфалогіі наогул і ўсходнеславянскага язычніцкага пантэона ў прыватнасці з'яўляецца адсутнасць ці недастатковая інфарматыўнасць крыніц. «Дастаткова поўных і, галоўнае, «унутраных», што прадстаўляюць саму язычніцкую традыцыю, крыніц у XIX ст. не было», – пісаў У. Тапароў [1, с.161]. Гаворачы аб праблемах рэканструкцыі старажытнай славянскай культуры, знакаміты расійскі археолаг В. Сядоў сцвярджаў, што ні адна з навук не мае дастаткова даных для самастойнага вырашэння праблемы паходжання і пачатковай гісторыі славян. Вучонымі-філолагамі неаднаразова сцвярджалася, што пісьмовыя крыніцы, якія выкарыстоўваюцца даследчыкамі для верыфікацыі сваіх гіпотэз славянскага язычніцтва, з'яўляюцца другаснымі ці нават прызнаюцца фальсіфікатамі [2]. Сцісла пісьмовыя крыніцы вывучэння міфалогіі ўсходніх славян акрэслены Т. Шамякінай і некаторымі іншымі даследчыкамі.

«Сур'ёзнай навуковай працы, якая б разглядала адначасова ўсе віды крыніц па ўсходнеславянскім язычніцтве, – піша беларускі гістарыёграф А. Буглак, – дасюль не існуе ні ў расійскай, ні ў беларускай, ні ва ўкраінскай гістарыяграфіі» [3, с.11]. Можна гаварыць аб заснаванні ў XIX ст. традыцыі ў вывучэнні міфалогіі, паводле якой, як сцвярджае В. Шарая, «пры даследаванні духоўнай культуры ўсходніх славян, яе рэлігійных формаў асаблівая ўвага надавалася рэканструкцыям язычніцкага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пантэона вышэйшых бостваў на падставе пісьмовых сярэдневяковых крыніц» [4, с.6].

Для сістэмнага асэнсавання праблемы вучэння славянскага пантэона і дэманалогіі неабходна ўлічваць, што рэканструкцыя духоўнай культуры славян, таксама як этнагенез, высвятленне гістарычнай прарадзімы славян, з'яўляюцца ў навуцы нявырашанымі. Не высветлены, паводле У. Сядова, станаўленне і пачатковы этап развіцця праславянскага этнасу, не выяўлены наслаенні, звязаныя з наступнай гісторыяй праславян і абумоўленыя ўзаемадзеяннем іх з кельтамі, германцамі, іранцамі, балтамі і іншымі этнічнымі групоўкамі. Маналітнасць протаславянскага пантэона была парушана гісторыяй славян – «пастаяннымі кантактамі славян у канцы I тысячагоддзя да н.э. і ў першай палавіне I тысячагоддзя н.э. з кельтамі, германцамі, скіфа-сарматамі, балтамі <...> Так з'явіліся, напрыклад, у паўднёва-ўсходняй частцы рассялення славян *Хорс* і *Сімаргл* ці на паўночным захадзе – свяцілішчы кельцкага паходжання. Ні пра якую маналітнасць славянскага язычніцтва ў сярэдзіне сярэдневяковай эры гаварыць ужо не даводзіцца» [5, № 5, с.68]. Гэты тэзіс падзяляюць М. Талстой і С. Талстая: «Гаварыць аб адзіным славянскім пантэоне цалкам немагчыма, таму што нават простае параўнанне двух дастаткова позніх лакальных пантэонаў – кіеўскага і паморскага – сведчыць аб двух розных структурных тыпах у моўных, міфалагічных і рэлігійных адносінах» [5, № 5, с.77]. Э. Зайкоўскі, які інтэрпрэтуе ў міфалагічным сэнсе даныя археалогіі, пацвярджае гэту выснову: паводле знаходак дрыгавічоў, да X ст. існавалі некалькі племянных разнавіднасцей язычніцтва [6, с.371–372].

Такім чынам, у сучаснай навуцы прызнаецца тэзіс, сфармуляваны ў працах міфолагаў, што ўсходнеславянскія міфалагічныя вераванні ўзыходзяць да індаеўрапейскай мінуўшчыны і таму характарызуюцца значнай архаічнасцю. Аднак у надзвычай вялікай ступені дыскусійным з'яўляецца пытанне аб наяўнасці агульнай усходнеславянскай функцыянальна-іерархічнай сістэмы бостваў (ці наяўнасці выключна рэгіянальных пантэонаў).

Рэканструкцыя «асноўнага міфа», распрацаваная В. Іванавым і У. Тапаровым у працы «Даследаванні ў галіне славянскіх старажытнасцей» (1974), займае ў вывучэнні славянскага язычніцтва адно з дамінуючых месцаў [3, с.59]. На матэрыяле беларускай і літоўскай традыцыі, зафіксаваным у тэкстах розных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жанраў, рэканструяваны ўніверсальны ў індаеўрапейскай традыцыі сюжэт міфа аб спаборніцтве Грамавержца і яго праціўніка – Змея, выяўлены асноўныя характарыстыкі персанажаў славянскага пантэона – Перуна і Вялеса.

Э. Зайкоўскі, развіваючы запачаткаванае яшчэ ў XIX ст. А. Кіркорам даследаванне міфалагічнага аспекту помнікаў матэрыяльнай культуры славян і балтаў, падкрэслівае каштоўнасць даных археалогіі для рэканструкцыі вобраза Вялеса. У прыватнасці, ён прыводзіць беларускія паданні пра камяні-краўцы, камяні-шаўцы, камяні-следавікі, курганы-валатоўкі [7]. Нагадаем, што яшчэ А. Кіркорам адноўлены некаторыя надзвычай істотныя характарыстыкі Перуна / Пяркунаса, прыналежнасць якога не толькі да міфалогіі балтаў і славян, але і да складу праславянскіх багоў сцвярджалася М. Талстым [8, с.173].

Самай спрэчнай праблемай у гісторыі вывучэння славянскай міфалогіі з'яўляецца праблема асэнсавання «боскага» статусу асобных міфалагічных персанажаў. Сярод значнай колькасці гіпотэз найбольш абгрунтаванай з'яўляецца гіпотэза М. і С. Талстых, У. Тапарова, В. Іванава аб тым, што ў жывой народнай традыцыі захаваліся толькі Пярун, Вялес і Макош, якія «паддаюцца частковай рэканструкцыі з мінімальнай доляй сумнення». А адзіным усеагульным, поўным і добра прадстаўленым культам, які паддаецца канкрэтнай рэканструкцыі, з'яўляецца культ памерлых [5, с.77–78]. Персанажамі, чыя «боскасць» выклікае сумненне, з'яўляюцца Ярыла, Купала, Марэна, Лада, Леля, Траян, Род і інш. [1, с.169]. Пры гэтым не аспрэчваецца тэзіс, што некаторыя з іх адыгрываюць значную ролю на іншых узроўнях славянскай міфалогіі. Пра спрэчныя моманты ў трактоўках сучасных айчынных міфолагаў сведчаць палажэнні, увасобленыя ў энцыклапедычным слоўніку «Беларуская міфалогія». Азначэнні статусу Сварога, Дажбога, Лады даюцца адпаведна – «адно са славянскіх божышчаў», «адзін з багоў усходніх славян», «адна з багіняў славянскага дахрысціянскага пантэона».

У плане метадалогіі міфалагічнага даследавання галоўным момантам пераемнасці ідэй міфолагаў з'яўляецца параўнальна-гістарычны метад аналізу з'яў традыцыйнай культуры. І сёння гэты метад выкарыстоўваецца ў рознай ступені крытычнага асэнсавання айчыннымі даследчыкамі: Зеўс / Юпітэр / Тор / Пяркунас / Пярун; Русалкі / Самавілы / Ундзіны / Наяды / Албасты; Вялес / Варуна; Цёця і Ляля / Дземетра і Персефона і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прырода многіх персанажаў ніжэйшай міфалогіі ўсходніх славян трактуецца як амбівалентная. Іх шкодныя дзеянні ў дачыненні да чалавека могуць быць нейтралізаваныя пры дапамозе замоў, ахвярапрынашэнняў, пэўных магічных прыёмаў.

Сучасныя падыходы патрабуюць не толькі крытычнага засваення спадчыны XIX ст., але і «ўліку шматслойнасці, іерархічнай арганізацыі сістэмы культуры, прысутнасці ў ёй якасна адрозных пластоў», а вялікая варыятыўнасць назваў аднаго і таго ж персанажа і ў той жа час агульнасць рыс і функцыянальных характарыстык розных персанажаў і сёння ствараюць заканамерныя цяжкасці ў вывучэнні ніжэйшай міфалогіі ўсходніх славян.


1. *Топоров, В. Н.* Боги древних славян / В. Н. Топоров // Очерки истории культуры славян / В. В. Седов, А. Ф. Журавлев, Н. И. Толстой [и др.]; Ин-т славяноведения и балканистики РАН. – М.: Индрик, 1996. – С. 160–174.

2. *Рукописи,* которых не было: подделки в области славянского фольклора: сб. / подгот. А. Л.Топорков [и др.]. – М.: Ладомир, 2002. – 967 с.

3. *Буглак, А. А.* Восточнославянское язычество в белорусской, российской и украинской историографии второй половины XX века / А. А. Буглак: дис. … канд. ист. наук.: 07.00.09. – Минск: БГУ, 2003. – 128 с.

4. *Шарая, В. М.* Актуальныя пытанні міждысцыплінарнага даследавання традыцыйнай культуры беларусаў / В. М. Шарая // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск: Права і эканоміка, 2008. – Вып. 4. – С. 454–458.

5. *Теоретические* проблемы реконструкции древнейшей славянской духовной культуры: дискуссия // Советская этнография. – 1984. – № 3. – С. 51–63; № 4. – С. 64–80; № 5. – С. 68, 77.

6. *Зайкоўскі, Э. М.* Язычніцтва ў светапоглядзе беларусаў / Э. М. Зайкоўскі // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя / уклад. В. К. Шчэрбін [і інш.]. – Мінск: АНІГН НАН Беларусі, – 1998. – С. 371–373.

7. *Зайкоўскі, Э. М.* Месца Вялеса ў дахрысціянскім светапоглядзе насельніцтва Беларусі / Э. М. Зайкоўскі. – Мінск: ЕГУ, 1998. – 16 с.

8. *Толстой, Н. И.* Очерки славянского язычества / Н. И. Толстой. – М.: Индрик, 2003. – 622 с.

9. *Швед, І. А.* Уводзіны ў фалькларыстыку: вучэб.-метад. дапам.: у 2 ч. / І. А. Швед; Брэсцкі дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст: БрДУ, 2009. – Ч. 1. – 92 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ